сацыялістычная сістэма, пачаўся бурны рост нацыянальна-вызваленчай барацьбы, якi прывёў да крушэння сістэмы каланіялізму, ліквідацыі каланіяльных імперый i стварэння самастойных дзяржаў.

[1] Чырвоная змена. 1979. 9 мая.
[2] Формирование коммунистической убежденности: из опыта работы кафедр истории КПСС вузов Белоруссии. Минск, 1984. С. 205.
[3] Там жа. С. 211—212.

Э. Я. ГЕРАСІМОВІЧ

# ПАРТЫЙНЫ ЎПЛЫЎ НА РАЗВІЦЦЁ І ЎМАЦАВАННЕ ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ У КАЛГАСАХ І САЎГАСАХ БЕЛАРУСКАЙ ССР (1976—1985)

Даследаванне i абагульненне вопыту, набытага сельскімі прафсаюзамі, мае важнае тэарэтычнае i практычнае значэнне ў вырашэнні праблем, што накапіліся за дзесяцігоддзі ў развіцці нашай вёскі. Праблем сапраўды ў сельскай гаспадарцы нямала, але ёсць i пэўная аснова для ix вырашэння. Гэта набыты працамі i памылкамі вопыт сацыялістычнай перабудовы вёскі, у якой адлюстраваны шматгадовая i карпатлівая праца беларускага народа i кіраўніцтва рэспублікі. У гэтым плане значную цікавасць уяўляе дзейнасць Кампартыі Беларусі ў 1976—1985 гадах.

Як вядома, адной з умоў паспяховай дзейнасці прафсаюзаў з'яўляецца ix масавасць. У. I. Ленін падкрэсліваў, што пры Савецкай уладзе развіццё прафчленства «...павінна быць даведзена да аб'яднання пагалоўна ўсіх працоўных у зладжаныя, цэнтралізаваныя, дысцыплінаваныя вытворчыя саюзы»[1].

Да 1976 года ў саўгасах Беларусі, як i ў цэлым у краіне, членамі прафсаюза былі ўсе, хто працаваў на пастаянных работах, а ў калгасах — толькі механізатары i спецыялісты сельскай гаспадаркі. Цяжка ўявіць справядлівасць таго, што паляводы i жывёлаводы ў калгасах не мелі арганізацыі, якая б прадстаўляла i абараняла ix інтарэсы.

У адпаведнасці з рэкамендацыямі XXV з'езда КПСС i рашэннем XI пленума ВЦСПС (верасень 1976 года) «Аб павелічэнні масавасці прафсаюзных арганізацый калгасаў» пачаўся прыём у члены прафсаюза ўсіх жадаючых калгаснікаў[2]. У даследуемы перыяд партыйныя арганізацыі рэспублікі значна ўзмацнілі ўвагу да дзейнасці прафсаюзаў, сталі праяўляць больш клопатаў аб ix арганізацыйным умацаванні, аб павышэнні ix ролі ў гаспадарчым i сацыяльна-культурным будаўніцтве, у выхаванні людзей. Звязаныя з гэтым пытанні неаднаразова разглядаліся ў Бюро ЦК КПБ, яны былі прадметам абмеркавання на XXI пленуме Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі (12 сакавіка 1980 года), на пленумах Мінскага, Брэсцкага i Гродзенскага абкомаў, многіх гаркомаў i райкомаў партыі. Пытанні прафчленства былі прадметам неаслабнай увагі прэзідыума, сакратарыята Белсаўпрофа, рэспубліканскага i абласных камітэтаў прафсаюза рабочых i служачых сельскай гаспадаркі i нарыхтовак.

Вялікая арганізатарская i растлумачальная работа дазволіла завяршыць прыём у прафсаюзы ўсіх жадаючых калгаснікаў у асноўным за два гады. У выніку беларускія прафсаюзныя арганізацыі сельскагаспадарчага профілю ўмацаваліся арганізацыйна, у ix адбыліся якасныя i колькасныя змяненні. Напрыклад, калі на 1 студзеня 1976 года ў 354 пярвічных прафсаюзных арганізацыях калгасаў Гродзенскай вобласці было 29 580 членаў прафсаюза, або па 83 чалавекі ў сярэднім на гаспадарку, то на 1 жніўня 1978 года 257 прафсаюзных арганізацый аб'ядналі 111 600 членаў прафсаюза, або 82,4 % усіх працаздольных калгаснікаў[3]. У гэты ж час больш за 100 тыс. працаўнікоў калгасаў было прынята ў члены прафсаюзаў у Брэсцкай вобласці[4].

Аднак не ўсюды гэта работа праводзілася энергічна i мэтанакіравана. Напрыклад, у Нясвіжскім раёне да 1979 года з 11 тыс. калгаснікаў было прынята ў прафсаюз толькі 4,5 тыс., або 40,7 %. Аналагічнае становішча склалася ў Старадарожскім, Барысаўскім i некаторых іншых раёнах Беларусі[5].

Работа па павелічэнню колькасці прафсаюзных арганізацый калгасаў не

заўсёды выкарыстоўвалася як важнае палітычнае мерапрыемства для далейшага росту вытворчай і грамадска-палітычнай актыўнасці працоўных калектываў. Часам у гэтай справе дапускаліся фармалізм і кампанейшчына, у прыватнасці такое становішча мела месца ў прафсаюзнай арганізацыі калгаса імя Гагарына Лідскага раёна. Тут да 1 чэрвеня 1978 года, гэта значыць за 18 месяцаў, было прынята ў прафсаюз толькі 9 новых членаў з 327 працуючых. Затым толькі на працягу чэрвеня мясцовая прафсаюзная арганізацыя павялічылася на 125 чалавек. У асобных выпадках пададзеныя калгаснікамі заявы аб прыёме ў прафсаюз не разглядаліся па два і больш месяцаў. Так, у калгасе «Маяк» і «Прагрэс» Мастоўскага раёна са студзеня па жнівень 1978 года не былі разгледжаны адпаведна 53 і 150 заяў [6].

Але нягледзячы на некаторыя ўпушчэнні ў рабоце па развіццю прафсаюзнага руху на вёсцы, да 1980 года агульная колькасць членаў прафсаюза ў калгасах рэспублікі склала 97,5 % агульнай колькасці працаздольных. Адзначаючы значны рост прафсаюзных арганізацый вёскі, XXI пленум ЦК КПБ звярнуў увагу камуністаў на тое, што прафесіянальны саюз работнікаў сельскай гаспадаркі патрабуе асаблівага клопату і задача парткомаў — дапамагчы калгасным прафсаюзным арганізацыям выйсці са стадыі станаўлення, заняць дастойнае месца ў вырашэнні ўсіх пытанняў сельскай гаспадаркі. Да гэтага часу ў цэлым па рэспубліцы не членаў прафсаюза налічвалася звыш 17 тыс. калгаснікаў. Асабліва значнай была база для росту прафсаюзных радоў у Пастаўскім, Талачынскім, Кастрычніцкім, Ляхавіцкім раёнах (ад 13 да 30 % занятых у калгаснай вытворчасці)[7].

Партыйныя арганізацыі рэспублікі нямала зрабілі для паляпшэння стылю і метадаў работы сельскагаспадарчых прафсаюзных арганізацый. Многія гаркомы і райкомы партыі, пярвічныя партыйныя арганізацыі калгасаў і саўгасаў аказвалі важкі ўплыў на дзейнасць прафарганізацый, забяспечвалі ім тую ролю і той аўтарытэт, якія адпавядаюць іх высокай місіі.

Пастаянную ўвагу развіццю ініцыятывы і актыўнасці прафсаюзных арганізацый на вёсцы праяўляў Слонімскі гарком партыі. Яго сакратары, загадчыкі аддзелаў, іншыя работнікі апарату наведвалі прафсаюзныя сходы, цікавіліся ўнутрысаюзнай работай. Многа станоўчага назіралася ў практыцы кіраўніцтва прафсаюзамі ў Асіповіцкім, Круглянскім райкомах партыі Магілёўскай вобласці, Бярозаўскім РК КПБ Брэсцкай вобласці і іншых. Быў вывучаны і распаўсюджаны вопыт Зельвенскага райкома прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі, а таксама прафарганізацыі калгаса «Шлях Леніна» Астравецкага раёна па арганізацыйнаму ўмацаванню прафсаюзных арганізацый. Адзначалася, што эфектыўны ўдзел прафсаюзнай арганізацыі гэтага калгаса ў сферы вытворчасці, у павышэнні ўзроўню жыцця працоўных, клопаце аб іх законных інтарэсах з'явіўся адным з пэўных момантаў перамогі ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве за дасягненне найвышэйшых вынікаў у вытворчасці і закупцы прадуктаў жывёлагадоўлі ў зімовы перыяд 1980—1981 гадоў.

З ростам радоў умацавалася арганізацыйная структура прафсаюзных арганізацый на вёсцы. Да 1980 году яны функцыянавалі ўжо ва ўсіх калгасах, былі створаны прафгрупы ў брыгадах, на фермах, вытворчых участках. Рэспубліканская партыйная арганізацыя пастаянна трымала ў полі свайго зроку пытанні ўдасканалення падбору і выхавання прафсаюзных кадраў і актыву ў калгасах і саўгасах. Гэтыя пытанні У. І. Ленін лічыў асноўнай умовай поспеху дзейнасці прафсаюзаў.

У практыцы работы партыйных камітэтаў выкарыстоўвалася калектыўнае вывучэнне кандыдатур, рэкамендаваных на прафсаюзную работу. Прыкметна павысілася роля і адказнасць пярвічных партарганізацый у вырашэнні кадравых пытанняў. Партыйныя камітэты ажыццяўлялі кантроль і ўсебаковую дапамогу прафсаюзным камітэтам у перыяд справаздачна-выбарных кампаній. Як правіла, на прафсаюзную работу рэкамендаваліся камуністы — рабочыя і служачыя, механізатары і спецыялісты калгасаў і саўгасаў, якія валодалі арганізатарскімі здольнасцямі, добра ведалі вытворчасць, карысталіся давер'ем у калектывах працоўных.

У даследуемы перыяд назіраўся няўхільны рост партыйнага ядра сельскіх прафсаюзных арганізацый, што аказвала значны ўплыў на ўзровень іх дзейнасці. Усяго ў канцы IX пяцігодкі ў саставе выбарнага актыву пярвічных сельскіх прафарганізацый рэспублікі працавала 29,4 тыс. членаў і кандыдатаў у члены КПСС. Яны складалі 48,5 % членаў прафсаюзных і 30,6 % цэхавых камітэтаў, 60,3 % старшынь цэхавых камітэтаў, 39,2 % прафгрупоргаў [8].

Сярод прафсаюзных работнікаў на вёсцы былі сотні, тысячы сапраўдных

энтузіястаў, людзей, якія аддавалі свае веды і вопыт, свае духоўныя сілы паўсядзённай карпатлівай рабоце з людзьмі. Да іх ліку можна аднесці старшыню Зельвенскага райкома прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі Багуславу Іванаўну Точаную, старшыню прафкома калгаса «Шлях да камунізму» Гродзенскага раёна Раісу Васільеўну Рахунак і іншых.

Прыкладам умелага кіраўніцтва дзейнасцю цэхавай прафсаюзнай арганізацыі можа служыць работа старшыні цэхавага камітэта малочна-таварнай фермы № 2 калгаса імя Гастэлы Мінскага раёна Соф'і Іванаўны Гарнашэвіч. Яна была чалавекам у калектыве вядомым, нефармальным лідэрам. Да яе ішлі за дапамогай, парадай і падтрымкай. Яна пастаянна клапацілася аб паляпшэнні ўмоў працы на ферме, аб жыллёва-бытавым і медыцынскім абслугоўванні, узмацненні выхаваўчай работы ў калектыве. Гэтым у немалой ступені былі абумоўлены поспехі працоўнага калектыву. Па выніках 1979 года калектыў выйшаў пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве сярод малочнатаварных ферм раёна, атрымаўшы надоі на адну фуражную карову 4408 кг[9].

Рост партыйнай праслойкі сведчыў аб высокім аўтарытэце камуністаў і давер'і, якія ім аказвалі члены прафсаюза ў вёсцы. На жаль, тут справа не абыходзілася без абсалютызацыі практыкі рэкамендацыі на пасады старшынь ФЗМК і прафгрупоргаў кандыдатаў толькі з ліку камуністаў і без уліку думак членаў прафсаюза. Партыйныя камітэты нярэдка адпраўлялі ў сельскагаспадарчыя прафсаюзныя арганізацыі тых, хто ў некаторай меры «выдахся», або наогул не праявіў сябе на іншых кіруючых пасадах, абы дапрацаваць да пенсіі, ці прыпрацаваць да яе. Здаралася, што на работу ў прафсаюзах траплялі алкаголікі, марнатраўцы, неаднаразова судзімыя. Так, за п'янства і развал прафсаюзнай работы былі вызвалены былыя старшыні рабачкомаў саўгасаў «Запаветы Ільіча» і «Светач» Чэрвеньскага раёна. Нешта падобнае мела месца ў Мінскім, Карэліцкім і іншых раёнах рэспублікі. Рабіць на падставе такіх фактаў значныя абагульненні было б няправільна, але і лічыць іх чыстай выпадковасцю таксама нельга. Думаецца, такое было магчыма ў выніку падмены партыйнымі камітэтамі палітычных форм і метадаў кіраўніцтва прафсаюзамі, практыкай адміністравання, камандавання прафсаюзнымі арганізацыямі, ігнаравання дэмакратычнымі прынцыпамі падбору і расстаноўкі кадраў.

Дамагаючыся павышэння актыўнасці камуністаў, адказнасці іх за дзейнасць сельскіх прафсаюзных арганізацый, партыйныя камітэты імкнуліся да пошуку эфектыўных арганізацыйных форм, выкарыстанню калектыўных і індывідуальных метадаў работы. У прыватнасці, заслугоўваюць увагі такія з іх, як справаздачы або паведамленні камуністаў на пленумах, бюро, партыйных сходах аб рабоце ў прафсаюзах; індывідуальныя субяседванні; сустрэчы з імі кіруючых партыйных работнікаў; сходы камуністаў, якія працуюць у выбарных прафсаюзных органах.

Аднак у гэтай справе слаба выкарыстоўваліся такія важныя арганізацыйныя формы партыйнага ўплыву на работу сельскіх прафсаюзаў, як партыйныя групы і пярвічныя партарганізацыі ў апаратах праforганаў. У прафсаюзах развіваліся бюракратызм, фармалізм, папяратворчасць. Недастаткова ажыццяўляўся кантроль з боку партыйных арганізацый. Усё гэта адмоўна адбівалася на ўзроўні работы пярвічных прафсаюзных арганізацый у сельскай гаспадарцы рэспублікі.

У цэлым жа дзейнасць партарганізацый рэспублікі ў 1976—1985 гадах садзейнічала развіццю і ўмацаванню сельскіх прафсаюзных арганізацый, стварэнню найбольш дабратворных умоў для павышэння іх ролі ў вырашэнні вытворчых, сацыяльных і культурных пытанняў на вёсцы.

Практыка цяперашняй перабудовы паказвае: з большасцю праблем на вёсцы можна справіцца толькі праз дэмакратызацыю ўсяго грамадскага жыцця. Цяжка пераацаніць узмацненне ў гэтай справе ролі прафсаюзаў.

[1] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 38. С. 120.
[2] Материалы XXV съезда КПСС. М., 1976. С. 84; XI Пленум ВЦСПС: Стегор. отчет. М., 1976. С. 102—103.
[3] ПА Гродзенскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 79, спр. 28, арк. 10.
[4] Гл.: Заря. 1979. 28 авг.
[5] ПА Мінскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 74, спр. 13, арк. 16; Ф. 173, воп. 16, спр. 3, арк. 80.
[6] ПА Гродзенскага АК КПБ. Ф. 1, воп. 79, спр. 28, арк. 13.
[7] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, воп. 134, спр. 2, арк. 40.
[8] Архіў Белсаўпрофа. Ф. 1, воп. 11, спр. 1517, арк. 58; спр. 1510, арк. 102.
[9] ПА Мінскага АК КПБ. Ф. 476, воп. 40, спр. 5, арк. 6—7.